*Галкоўская Юлія Мікалаеўна,*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў,
старшы выкладчык кафедры менеджменту
інфармацыйна-дакументнай сферы

## Накірункі ўдасканалення адукацыйнага працэсу па падрыхтоўцы бібліятэкараў-бібліёграфаў вышэйшай кваліфікацыі ў Рэспубліцы Беларусь

*Разглядаюцца знешнія і ўнутраныя фактары, якія абумоўліваюць неабходнасць мадэрнізацыі адукацыйнага працэсу падрыхтоўкі кадраў па спецыяльнасці бібліятэказнаўства і бібліяграфія, акцэнтуецца ўвага на сусветных тэндэнцыях развіцця вышэйшай адукацыі і на пераўтварэннях, якія адбываюцца ў Рэспубліцы Беларусь. Робяцца спасылкі на адукацыйны стандарт АС РБ 1-23 01 11-2008 «Спецыяльнасць 23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках)». Вызначаецца шэраг праблем, якія існуюць на сучасным этапе пры падрыхтоўцы бібліятэкараў-бібліёграфаў вышэйшай кваліфікацыі, выказваюцца прапановы па іх пераадоленню.*

Патрэбнасць ва ўдасканаленні адукацыйнага працэсу падрыхтоўкі бібліятэкараў-бібліёграфаў вышэйшай кваліфікацыі ў Рэспубліцы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларусь абумоўлена шэрагам фактараў, якія можна падзяліць на знешнія і ўнутраныя.

Знешнімі фактарамі, перш за ўсё, з'яўляюцца значныя змены ў грамадскім разуменні ролі адукацыі ў жыцці грамадства. Універсітэцкае навуковае і адукацыйнае асяроддзе разглядаецца ў апошняе дзесяцігоддзе як асноўная крыніца і база для рэалізацыі стратэгіі эканамічнага росту той ці іншай краіны на аснове ведаў [2, с. 3]. Змяняецца парадыгма выкладання «выкладчыкі вучаць студэнтаў» на парадыгму навучання «студэнты вучацца ў выкладчыка». Студэнтам дэлегіруецца свабода і адказнасць выбару сваёй траекторыі навучання [4, с. 8]. Змены, якія адбываюцца, знайшлі адлюстраванне ў шэрагу міжнародных дакументаў: «Рэформа і развіццё вышэйшай адукацыі: праграмны дакумент» (ЮНЕСКА, 1995 г.); «Сусветная дэкларацыя аб вышэйшай адукацыі для XXI стагоддзя» (ЮНЕСКА, 1998 г.); Аб 'яднаная дэкларацыя еўрапейскіх міністраў адукацыі «Еўрапейская галіна вышэйшай адукацыі» (Балоння, 1999 г.), ці, інакш гаворачы, «Балонскі працэс» [3, с. 33].

Сусветныя тэндэнцыі развіцця вышэйшай адукацыі можна звесці да наступных: абнаўляюцца мэты і прынцыпы вышэйшай адукацыі; рэалізуецца кампетэнтнасны падыход да адукацыі як новая парадыгма студэнтацэнтрыраванай адукацыі; асноўны ўпор робіцца на міждысцыплінарны падыход у сістэме навучання; ажыццяўляецца тэхналагізацыя адукацыі; асаблівая ўвага ўдзяляецца кантролю якасці адукацыі і дыягностыцы вынікаў навучання; абнаўляюцца стандарты адукацыі; рэалізуюцца інавацыйныя падыходы ў навукова-метадычным забеспячэнні працэсу адукацыі; адбываецца глабалізацыя і інтэрнацыяналізацыя вышэйшай адукацыі.

Мадэрнізацыя вышэйшай прафесійнай адукацыі прадугледжвае, перш за ўсё, разглядаць у якасці выніку падрыхтоўкі спецыялістаў не паказчык сумы атрыманых студэнтамі ведаў, а дзейнасна-практычную здольнасць прымяняць веды і ўменні, выкарыстоўваць іх для рашэння канкрэтных прафесійных задач і праблемных сітуацый. Індыкатарам такіх здольнасцей і ўвогуле якасці прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў павінны выступаць кампетэнцыі як абагульненая характарыстыка прафесіяналізму спецыяліста [3, с. 88]. У сваю чаргу, развіццё ў студэнтаў комплекса кампетэнцый забяспечвае канчатковы інтэграваны вынік адукацыі — фарміраванне ў выпускніка сацыяльна-прафесійнай кампетэнтнасці па канкрэтнай спецыяльнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сучасныя тэндэнцыі перагляду падыходаў арганізаці адукацыйнага працэсу паўплывалі і на працэсы па ўдасканаленню падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь. Па заказу Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь і Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь распрацоўваюцца беларускія стандарты вышэйшай адукацыі новага пакалсння, з улікам патрабаванняў міжнароднага стандарту ISO 9001:2000.

У 2008 г. у Рэспубліцы Беларусь уведзены ў дзеянне першы дзяржаўны стандарт бібліятэчнай адукацыі [6], у якім рэалізуецца кампетэнтнасны падыход да падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне бібліятэчнай справы. Стандарт стварае аб'ектыўныя ўмовы для пераходу студэнта ў катэгорыю актыўнага ўдзельніка адукацыйнага працэсу. У ім вызначаецца, што выпускнік ВНУ пасля адаптацыі да 1 года павінен быць кампетэнтным у наступных відах дзейнасці: вытворча-тэхналагічнай; сацыяльна-культурнай; навукова-метадычнай; навукова-даследчай; арганізацыйна-кіраўніцкай; педагагічнай; інавацыйнай. На авалоданне пералічанымі відамі дзейнасці арыентаваны ўсе напрамкі прафесійнай адукацыі, у залежнасці ад сферы дзейнасці яны канкрэтызуюцца з арыентацыяй на асобную прафесію. Засваенне форм і метадаў гэтых відаў дзейнасці прадугледжвае фарміраванне адукацыйным працэсам комплексу кампетэнцый акадэмічных, сацыяльна-асобасных і прафесійных груп кампетэнцый [6, с. 4]. Але трэба адзначыць, што на сённяшні дзень пакуль не распрацаваны абгрунтаваны пералік кампетэнцый, якія павінны фарміравацца ў працэсе падрыхтоўкі бібліятэкараў-бібліёграфаў вышэйшай кваліфікацыі. Гэтае пытанне застаецца дыскусійным, што прадугледжвае ажыццяўленне адпаведнай даследчай работы.

Разгледзім унутраныя фактары, якія абумоўліваюць неабходнасць удасканалення адукацыйнага працэсу падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі па спецыяльнасці «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія»: нізкі статус прафесіі беларускага бібліятэкара-бібліёграфа; заніжаная прафесійная самаацэнка студэнтаў, якія навучаюцца па спецыяльнасці «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія»; слабая сістэма матывацыі студэнтаў да творчага падыходу ў навучанні; недастатковае разумение студэнтамі значнасці для іх будучай прафесійнай дзейнасці асобных дысцыплін і ўсяго комплексу вывучаемых прадметаў увогуле пры падрыхтоўцы па спецыяльнасці; адставанне па некаторых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

параметрах бібліятэчнай адукацыі ад практыкі, якая дынамічна развіваецца (гэта звязана, перш за ўсё, з недастатковай забяспечанасцю вучэбнага працэсу сучаснымі камп'ютарнымі праграмамі для навучання, аналагічных тым, што ўведзены ў практыку работы бібліятэк), і г. д.

Такім чынам, ёсць унутраныя і знешнія перадумовы для ўдасканалення адукацыйнага працэсу. Мэтай удасканалення адукацыйнага працэсу па падрыхтоўцы бібліятэкараў-бібліёграфаў, на наш погляд, павінна быць павышэнне задаволенасці спажыўцоў гэтага віду адукацыйных паслуг: з аднаго боку студэнтаў; з другога работадаўцаў.

Для арганізацыі эфектыўнай работы па ўдасканаленню адукацыйнага працэсу па падрыхтоўцы бібліятэкараў-бібліёграфаў вышэйшай кваліфікацыі, па нашаму меркаванню, неабходна на пастаяннай аснове ажыццяўляць:

- маніторынг пазітыўнага замежнага вопыту ў падрыхтоўцы бібліятэчных спецыялістаў з мэтай збліжэння адукацыйных праграм, іх інтэрнацыяналізацыі;
- маніторынг прапаноў прафесарска-выкладчыцкага саставу па ўдасканаленню адукацыйнага працэсу па падрыхтоўцы бібліятэкараў-бібліёграфаў вышэйшай кваліфікацыі;
- маніторынг бачання вядучымі спецыялістамі бібліятэк ведаў і ўменняў (канкрэтызавана), неабходных выпускнікам у пачатку іх прафесійнай дзейнасці па спецыяльнасці «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія» (з акцэнтам на веды і ўменні, якіх не хапае выпускнікам, якія ўжо пачалі сваю прафесійную дзейнасць);
- ацэнку задаволенасці, а таксама патрабаванняў рэальнага і/ці патэнцыяльнага работадаўцы; вывучэнне сацыяльнай эфектыўнасці адукацыйнага працэсу па падрыхтоўцы бібліятэкараў-бібліёграфаў вышэйшай кваліфікацыі;
- маніторынг задаволенасці студэнтаў адукацыйным працэсам і атрымліваемымі ведамі, уменнямі і вопытам;
- дыягнаставанне кампетэнцый (ведаў, уменняў і вопыту, неабходных для рашэння тэарэтычных і практычных задач) студэнтаў-выпускнікоў;
- дыягнастычныя даследаванні якасці адукацыйнага працэсу па падрыхтоўцы бібліятэкараў-бібліёграфаў вышэйшай кваліфікацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На наш погляд, для таго каб бібліятэчная адукацыя была прадуктыўнай, запатрабаванай і якаснай, неабходна:

- у аснову арганізацыі адукацыйнага працэсу палажыць крэдытна-модульную сістэму, аналагічную еўрапейскай сістэме ECTS, і адпаведна актуалізаваць вучэбна-метадычную базу на аснове модульнай тэхналогіі;
- сістэмна ўкараняць у навучальны працэс інавацыйныя адукацыйныя тэхналогіі, адэкватныя кампетэнтнаснаму падыходу пры падрыхтоўцы выпускніка (у тым ліку, мадэлі кіруемай самастойнай работы студэнтаў, рэйтынгавыя тэхналогіі, тэставыя і іншыя сістэмы ацэньвання кампетэнцый);
- максімальна выкарыстоўваць актуальныя камп'ютарныя праграмы ў навучальным працэсе;
- стварыць і затым пастаянна актуалізаваць банк інавацыйнага практычнага вопыту;
- узмацніць непасрэдную сувязь тэарэтычнага навучання з практычнай дзейнасцю;
- распрацаваць механізм якаснай зваротнай сувязі паміж суб'ектамі працэсу навучання (студэнты, выкладчыкі, работадаўцы); кансалідацыя суб'ектаў адукацыйнага працэсу: універсітэта; работадаўцы; студэнта;
- распрацаваць сістэму фарміравання і падтрымкі высокай матывацыі студэнтаў да навучання;
- распрацаваць мадэль студэнта-выпускніка па спецыяльнасці «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія» (мадэль прафесійнай падрыхтоўкі студэнта);
- распрацаваць мадэлі фарміравання прафесійных кампетэнцый студэнтаў (напрыклад, мадэль фарміравання прававой кампетэнцыі студэнтаў).

У завяршэнне неабходна адзначыць, што сучасная сістэма спецыяльнай падрыхтоўкі кадраў у галіне бібліятэчнай справы павінна арыентавацца на навучанне кваліфікаваных спецыялістаў з актыўнай самастойнай пазнавальнай, мысліцельнай дзейнасцю, спецыялістаў, якія валодаюць спосабамі пазнавальнай дзейнасці і якія прызнаюць першаснасць абавязкаў і адказнасці ў сваёй

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прафесійнай дзейнасці. Падрыхтоўка такога канкурэнтаздольнага спецыяліста патрабуе адпаведнай арганізацыі навучальнага працэсу на навуковай аснове.

***Літаратура***


1. *Демчук, М. И.* Высшая школа в стратегии инновационного развития Республики Беларусь / М. И. Демчук. — Минск : РИВШ, 2006. — 300 с.

2. *Демчук, М. И.* Системная методология инновационной деятельности / М. И. Демчук, А. Т. Юркевич. — Минск : РИВШ, 2007. — 304 с.

3. *Жук, О. Л.* Педагогическая подготовка студентов: компетентностный подход / О. Л. Жук. — Минск : РИВШ, 2009. — 336 с.

4. *Кузнецова, Т.* Библиотечио-информационное образование в России и Болонский процесс: барьеры на пути к новой модели подготовки кадров [Электронный ресурс] / Т. Кузнецова // World Library and Information Congress: 75-th IFLA General Conference and Council : 23-27 August 2009, Milan, Italy. — 2009. — Режим доступа: http://www.ifla.org/files/hq/papers/ifla75/86-kuznetsova-ru.pdf. — Дата доступа: 24.11.2010.

5. *Макаров, А. В.* Стандарты высшего образования нового поколения: сравнительный анализ / А. В. Макаров, Ю. С. Перфильев, В. Т. Федин ; под ред. проф. А. В. Макарова. — Минск : РИВШ, 2009. — 268 с.

6. ОС РБ 1-23 01 11-2008. Вышэйшая адукцыя. Першая ступень. Спецыяльнасць Е 1-23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках). Кваліфікацыя — Бібліятэкар-бібліёграф. Узамен Стандарта РД РБ 02100.5.211-98; уведз. 12.06.2008. — Мінск : Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, 2008. — 38 с.



***Summary***

*The article stresses the importance of the internal and external factors that necessitated the upgrading of the educational process of training in a specialty library science and bibliography. The author has indicated the problems that exist in the training of highly qualified librarian-bibliographers, makes suggestions for overcoming these problems.*


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ